# Гук [ў] і яго абазначэнне на пісьме

**А. Л. Сталыгва,**
настаўнік пачатковых класаў
СШ № 2 г. Полацка

Стрыжнем заняткаў па беларускай мове ў 2 класе з'яўляецца арганізацыя маўленчай дзейнасці вучняў. З гэтай мэтай можна выкарыстаць матэрыял наступнага ўрока.

**Тэма ўрока. Гук [ў] і яго абазначэнне на пісьме**

**І. Актуалізацыя вывучанага**

1) Развучваецца скорагаворка з мэтай адпрацоўкі правільнага вымаўлення гука [ч] і развіцця маўленчага апарату вучняў.

«Чэрвень! Чэрвень! Вакол чырвань. Зачарнеўся барок. Заквітнеў чабарок»

2) *Гульнёвы момант «Вушкі – далонькі».* Настаўнік чытае загадку, вучні знаходзяць у ім словы з гукам [ч] і пляскаюць у далоні.

Маю чорненькі таўкач,
Але круп ім не таўку.
Як расту,
Мяне ты ўбачыш
На балотцы,
На стаўку.
Пастарэю – распушуся.
Угадай: як я завуся? (**Мячэўнік**)

*Тлумачэнне слова*: чарот – высокая вадзяная або балотная расліна (рус. рогоз). Не блытаць з чаротам (рус. – камыш).

**ІІ. Вывучэнне новага матэрыялу**

**Новы матэрыял**: знаёмства з гукам [ў], абазначэннем яго літарай **ў.**

Зачытваецца казка Я. Коласа «Леў і воўк». *(Чытае настаўнік або добра падрыхтаваны вучань.)*

З якімі казачнымі героямі вы пазнаёміліся? *(Конь, леў і воўк.)*

У падручніку на с. 33 дзеці разглядаюць малюнкі і чытаюць беларускія словы.

✓ Вымавіце словы *леў і воўк* на рускай мове. *(Волк, лев.)*
✓ Якім гукам адрозніваецца вымаўленне беларускіх слоў ад рускіх? Якой літарай абазначаецца гэты гук?

*Паказваецца літара* ***ў – у нескладовае****, якой абазначаецца гук [ў]. Супастаўляюцца літары* ***у, ў****.*

*Арфаграфічная размінка ( с. 34, пр. 63).*

*Гульнёвы момант «Тварык – далонькі»*: на слыхавое адрозненне гукаў [у], [ў]. Настаўнік называе словы, вучні, пачуўшы ў словах [у], выцягваюць губы трубачкай (імітуюць вымаўленне галоснага гука), калі ж чуюць гук [ў], то пляскаюць у далоні.

*Словы для выкарыстання*: луг, роў, лаўка, воўна, мука, лоўка, урок, поўдзень, жыў, жыву, будоўля, куры і г.д.

Увага класа звяртаецца на дошку, дзе запісана скорагаворка.

Дзед вітае ўнукаў:
- Мае дзеткі!

Радасна бабуля:
- Мае кветкі!

І кот Цішка:
- Мяў, мяў, мяў!

Шчанюк Цюлік:
- Гаў, гаў, гаў!

Як вітаў сваіх дзетак кот Цішка? А шчанюк Цюлік? Адкажыце на пытанні: кот што робіць? *(Мяўкае.).* Сабака што робіць? *(Гаўкае.)* Паўтарыце сказанае без пытанняў.

*Праца з тэкстам па падручніку с. 35, пр. 65.*

Прачытайце загаловак да тэксту. Як вы думаеце, пра што пойдзе ў ім размова? Адгадаўшы загадкі, вы даведаецеся, пра каго ідзе размова ў тэксце.

Шапачка маленькая,

Камізэлечка нятканая,

Кафтанік рабенькі,

Ды ходзіць босенькі. *(Верабей.)*

*Вучні слухаюць узорнае чытанне тэксту настаўнікам.*

Пытанні. Хто галоўны герой апавядання? Што згубіў Андрэйка ў парку? Хто заняў яго рукавіцу? Што было ў рукавіцы?

Прачытайце тэкст самастойна і назавіце ў ім словы з гукам [ў].

Чаму тэкст мае загаловак «Рукавіца»? Падмацуйце свой адказ радкамі з тэксту.

*Гульня «Канструктар».* На дошцы прымацаваны таблічкі са словамі: *Радзімы, без, салаўю, што, песні, чалавеку, без.* Вучні складаюць прыказку. Размяркоўваюць таблічкі па парадку, правяраюць па падручніку , запісваюць у сшытках, падкрэсліваюць літару ў.

**III. Абагульненне пройдзенага**

**Абагульненне:** з якім гукам мы знаёміліся на ўроку? Якой літарай ён абазначаецца?

*Вучні па чарзе змяняюць першую літару ў слове* ***быў*** *і вымаўляюць новыя словы: быў- жыў-рыў-мыў-ныў-шыў-выў.*